14 сакавіка 2023 года

# ГАДАВЫ РАПАРТ

НАЦЫЯ ЛІДЭРАЎ
АНЛАЙН-ХАБ ДЛЯ НАВУЧАННЯ І СУПРАЦОЎНІЦТВА

## ХТО МЫ ТАКІЯ. НАШЫ МЭТЫ

ДАСЯГНЕННІ Ў 2022
ПЛАНЫ НА 2023

www.nationofleaders.org



ПАЛЯПШАЙ СВАЁ ЖЫЦЦЁ ЎЖО ЦЯПЕР

# Хто мы такія, нашы мэты

**Каманда Нацыі Лідэраў складаецца з прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці, якім неабыякавая будучыня Беларусі.**

Гэта аўтары і выкладчыкі курсаў, вядучыя майстар-класаў, эксперты, грамадскія дзеячы, а таксама спецыялісты, якія дапамагаюць ствараць адукацыйныя прадукты, адміністраваць іх і прасоўваць.
Мы бачым адукацыю адным з самых істотных фактараў для якаснай змены беларускага грамадства, дзякуючы чаму Беларусь атрымае магчымасць не толькі выйсці з грамадска-палітычнага крызісу, але і надалей забяспечыць умовы для ўстойлівага развіцця.








Мы ствараем адукацыйную экасістэму, у якой беларусы могуць, развіваючыся, змяняцца, набываць новыя кампетэнтнасці, атрымліваць падтрымку, узмацняючы сэнсы і каштоўнасці, уласцівыя актыўным удзельнікам грамадзянскай супольнасці. У такой сістэме ўзмацняюцца сацыяльныя сувязі, складаюцца супольнасці, развіваюцца навыкі ўзаемадзеяння і фарміруецца канструктыўная культура камунікацыі.
Такім чынам, мы дапамагаем беларусам і беларускім суполкам узмацняць свой патэнцыял, самім уплываць на сваё асяроддзе, спрыяючы глыбінным зменам грамадзянскай самасвядомасці і развіццю іншых грамадзян і супольнасцяў.

Акрамя таго мы імкнемся унесці свой уклад у развіццё адукацыйнай сістэмы дарослых у кааперацыі з іншымі праактыўнымі суб'ектамі.

**Мы пачалі сваю дзейнасць у 2021 годзе і значна развіліся за 2022 год.**

# Нашы дасягненні ў 2022 годзе

**7** новых адукацыйных праграм (курсаў)

**29** патокаў адукацыйных праграм (4-х створаных у 2021 і 7-мі - ў 2022)

**3245** унікальных карыстальнікаў адукацыйнай платформы (прырост у 2022 г. – 2265)

**69** адкрытых анлайн мерапрыемстваў:

- **18** сустрэч з Гасцямі Нацыі Лідэраў (грамадскімі дзеячамі і экспертамі ў розных галінах)
- **51** майстар-клас, у тым ліку 29 падтрымліваючых галасавых чатаў з псіхолагамі

## Таксама ў 2022 годзе:



- каманда НЛ вырасла на 14 чалавек, чые кампетэнцыі, досвед і навыкі значна павялічылі патэнцыял арганізацыі
- члены каманды прынялі ўдзел у больш чым 50 мерапрыемствах (канферэнцыі, форумы, семінары, дыскусіі), накіраваных на развіццё сферы нефармальнай адукацыі, культуры і грамадска-палітычнай дзейнасці, што дазволіла павысіць наш прафесіяналізм і наладзіць супрацоўніцтва з іншымі арганізацыямі, экспертамі, партнёрамі
- паспяхова прайшлі фінансавы аўдыт

# Нашы адукацыйныя прадукты 2021-2022

- **Правы грамадзяніна Беларусі**
  Вывучэнне і абарона грамадзянскіх правоў для паляпшэння свайго жыцця ўжо зараз
- **Ступені. Пераадоленне выгарання. Аднаўленне рэсурсу**
  Праграма аднаўлення сіл: усвядоміць свае эмоцыі і знайсці дарогу да выхаду з апатыі і расчаравання
- **Антыпрапаганда. Вучымся працаваць з фактамі і выкрываць міфы**
  Развіццё крытычнага мыслення і ўменняў камунікаваць са схільнымі да веры ў прапаганду
- **Самаарганізацыя: зразумець сябе і змяніць сваё жыццё**
- **Экстранная псіхалагічная дапамога**
  Аказанне экстранай не прафесійнай дапамогі ў стрэсавых сітуацыях
- **Мэта. План. Вынік.**
  Фармуляванне, планаванне і рэалізацыя мэт эфектыўна і захоўваючы жыццёвы рэсурс
- **Публічная палітыка для пачаткоўцаў**
  Зразумець сваю ролю ў развіцці дзяржавы, умець эфектыўна ўплываць на гэты працэс
- **Радавод. Аднаўляем гісторыю сваёй сям'і і краіны**
- **Камунікацыя. Майстэрства дзелавога ўзаемадзеяння**
  Камунікацыя як інструмент сумеснай дзейнасці для прыняцця і рэалізацыі рашэнняў
- **Сейбіт Прамовы. Эфектыўны публічны выступ**
  Вывучэнне асноў аратарскага мастацтва, развіццё навыкаў публічных выступленняў
- **Разам. Наладжваем камфортныя адносіны ў нашай суполцы**
  Стварэнне атмасферы даверу і творчасці ў групе праз пераадоленне індывідуальных псіхалагічных праблем і навучанне метадам эфектыўнага ўзаемадзеяння
- **Сустрэчы з экспертамі (інтэрв'ю з гасцямі, майстар-класы)**

# Колькасць удзельнікаў курсаў 2021-2022




- Разам. Наладжваем камфортныя адносіны ў нашай суполцы
- Мэта. План. Вынік.
- Камунікацыя. Майстэрства дзелавога ўзаемадзеяння
- Сейбіт Прамовы. Эфектыўны публічны выступ
- Радавод. Аднаўляем гісторыю сваёй сям'і і краіны
- Публічная палітыка для пачаткоўцаў
- Экстранная псіхалагічная дапамога
- Правы грамадзяніна Беларусі
- Ступені. Пераадоленне выгарання. Аднаўленне рэсурсу
- Самаарганізацыя
- Антыпрапаганда

# Фінансавая ўстойлівасць у 2022

**Большую частку каманды складаюць валанцёры, аб'яднаныя агульнымі мэтамі і каштоўнасцямі.**

Высока ацанілі працу Нацыі Лідэраў і самі ўдзельнікі курсаў: падтрымалі данатамі, падарылі абсталяванне, некалькі выпускнікоў увайшлі ў каманду. У гэтым годзе выкладчыкі і члены каманды атрымалі сотні падзяк за сваю працу, дапамогу, падтрымку (у анкетах пасля заканчэння курса, у чаце, у асабістых паведамленнях, падчас вэбінараў).
Дзейнасць НЛ і яе адукацыйны патэнцыял станоўча ацанілі чатыры фонды падтрымкі развіцця грамадзянскай супольнасці Беларусі. Фінансавая падтрымка з іх боку дазволіла развівацца больш сістэмна, стварыць некалькі новых адукацыйных праграм, уцягнуць у навучанне большую колькасць людзей.

# Крыніцы фінансавання ў 2022

**Унутраныя крыніцы фінансавання**

**Знешнія крыніцы фінансавання**



# Структура выдаткаў у 2022




- Падаткі і страхавыя ўнёскі
- Партнерскія праекты
- Адміністратыўныя выдаткі
- Стварэнне новых адукацыйных праграм
- Правядзенне курсаў, адкрытых анлайн імпрэз
- Прасоўванне курсаў, платформы, падзеяў

# Планы на 2023

**Мэты:**

- умацоўваць патэнцыял адукацыйнай экасістэмы, нарошчваць рэсурсы яе функцыянавання і развіцця
- развіваць супольнасць Нацыі Лідэраў
- умацоўваць сістэму бяспекі з улікам магчымых рызык
- развіваць прафесійныя навыкі выкладчыкаў і каманды
- працаваць над устойлівасцю арганізацыі
- пашыраць супрацоўніцтва з іншымі ініцыятывамі і арганізацыямі з блізкімі місіямі, якія дзейнічаюць у галіне адукацыі дарослых і сумежных галінах, звязаных з умацаваннем патэнцыялу беларускай грамадзянскай супольнасці.

**Задачы:**

- стварыць і запусціць не менш за **5** новых адукацыйных праграм
- правесці не менш за **40** патокаў існуючых і новых курсаў
- зарэгістраваць не менш чым **2000** удзельнікаў на курсы платформы
- правесці не менш за **12** сустрэч з Гасцямі і **12** майстар-класаў
- запусціць не менш за **2** партнёрскія праекты
- стварыць базу экспертаў, каб дапамагчы забяспечыць доступ да сэрвісаў, якія спадарожнічаюць адукацыі для комплекснай падтрымкі актыўных беларусаў
- правесці аўдыт адукацыйнай дзейнасці Нацыі Лідэраў з мэтай павышэння якасці

# Нашы кантакты

Адукацыйны Хаб
https://nationofleaders.org/

Тэлеграм-канал
https://t.me/nationofleaders_channel

Facebook
https://www.facebook.com/nationofleaders.org

Youtube
https://www.youtube.com/channel/UCjK4cecltrRTAorGbx8y1-w

Instagram
https://www.instagram.com/nationofleaders_insta

Падкасты
https://soundcloud.com/nationofleaders

Фонд грамадзянскага развіцця “Нацыя Лідэраў”
Вул. Клапатоўскага 22,
03-717 Варшава, Польшча
KRS: 0000914944, REGON 389670207
NIP 1133038692
www.nationofleaders.pl
biuro@nationofleaders.pl